***Парэйка П. А., Пацяюк А. Л.***

**БЕЛАРУСЬ І РАСІЯ Ў ПРАСТОРЫ ЎСХОДНЕСЛАВЯНСКАЙ ЦЫВІЛІЗАЦЫІ**

***Навуковыя кіраўнікі: канд. філас. навук, дац. Вашко А. А., ст. выкл. Альховік М.К.***

*Кафедра філасофіі і паліталогіі*

*Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт, г. Мінск*

**Актуальнасць.** Праблема існавання ўсходнеславянскай цывілізацыі заўсёды была прадметам вострай палемікі і дыскусій у навуковым асяроддзі і публіцыстыцы. Застаецца нявызначаным месца беларускага народу ў кантэксце гэтай цывілізацыі. Існуючая на сённяшні час Садружнасць Незалежных Дзяржаў мае аднолькавыя інтэнцыі як да большай інтэграцыі, так і да падзелу. У беларускім соцыюме праблема самаідэнтыфікацыі этнасу беспасярэдне ўплывае на курс краіны на міжнароднай арэне. Вызначэнне праблематыкі ўплыву Расіі на фарміраванне ментальных асаблівасцяў беларусаў таксама з’яўляецца водгукам заблытанасці цывілізацыйнага пытання.

**Мэта:** вызначэнне фундаментальных характарыстык усходнеславянскай цывілізацыі ў сувязі з сучасным геапалітычным становішчам.

**Матерыялы и метады.** Было прааналізавана больш за 70 літаратурных крыніц для таго, каб разгледзець праблему з розных бакоў і ў рэшце рэшт зрабіць уласныя вывады па данай праблематыке. Пры даследванні былі выкарыстаны наступныя метыды: абстрагірванне і індукцыя.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** У пытанні аб існаванні ўсходнеславянскай цывілізацыі можна заўважыць наступную заканамернасць. Заходнія вучоныя XIX-XX стст. прызнаюць існаванне гэтай цывілізацыі, так як на іх вачах Расія была магутнай дзяржавай, якая супрацьстаяла Захаду. Таксама прыхільнікамі інтэгральнага адзінства зямлі Рускай былі кіеўскія летапісцы, шэраг кіеўскіх князёў, эліта Расійскай дзяржавы і прадстаўнікі рускай улады на месцах. Сёння гэта шматлікія палітыкі, грамадскія і культурныя дзеячы, якія сталі сведкамі распаду гэтай цывілізацыі, бо ў выніку канфлікту ўсходнеславянскай цывілізацыі з заходнееўрапейскай, супердзяржава, якую збіралі рускія цары і бальшавікі, перастала існаваць. Беларусам жа ўласціва імкненне ўсяго толькі заняць “свой пачэсны пасад між народамі”, да прававой і дэмакратычнай дзяржавы, талерантнасць і плюралізм, сціснутасць паміж амбітнымі суседзямі, недавер да пераменаў.

**Выводы.** Усходнеславянская цывілізацыя ў беларускай філасоўскай інтэрпрытацыі характаразуецца плюралізмам поглядаў. Назіраецца уплыў канцэпцый фарміравання гэтай цывілізацыі на сучаснае геапалітычнае становішча. У сузязі з гэтым трэба разглядать шляхі развіцця Беларусі як краіны праз прызму прыведзенай вышэй цывілізацыі.